м патрэбны спэцыялістыя, якія зьвязалі-б глыбокую тэхнічную падрыхтоўку шырокім грамадзка-палітычным кругазорам і ўменьнем арганізоўваць творчую актыўнасьць мільёнаў мас працоўных.

Палепшым якасьць вучобы.

одна дырэктыў Бюро каляктыву Б і партсходу, па лініі Выканпрыняты цэлы шэраг мерапрыпа правядзеньні ў жыцьцё ноў Лістападаўскага Пленуму ЦК І(б) і канкрэтна зроблена наае:

Дадзена ўказаньне ўсім Прафаб неадкладным і сыстэматычвызваленьні ад грамадзкай працы студэнтаў апошніх курсаў за вынем тых, якія знаходзяцца на чых пасадах. З другога боку прырашучыя захады да 100% ахапія студэнтаў II і III і часткова курсаў карысна-выхаваўчай граай працай. Выканбюро лічыць, далейшае трыманьне студэнтаў эных тэхнічных працах, як у БДУ па-за ім не адпавядае задачы Гэты выгляд грамадзкай нагрузкі осіць сапраўды выхаваўчага хару, чаму павінен быць зьведзе да мінімуму. Мала карысным і шкодным для акадэмжыцьця лічыць і тое, што некаторая студэнтаў у якасьці грамадзкіх зкаў мела па 4—5 нагрузак, што ала якасьць іх працы і добраеныя адносіны да яе. У далейшым нбюро лічыць мэтазгодным і каным, каб лік грамадзкіх нагрузак ераравышаў 2-х, а там, дзе такія ы ёсьць, усім Прафкомам неадна прыняць захады да ўрэгуляня нагрузак.

а гэтага часу адсутнічае сталы г працоўнай дыспыпліны як стуаў, так і навуковых працаўнікоў. яты шырокія мерапрыемствы для му працоўнае дысцыпліны і паньня якасьці працы. Канкрэтна: ь пэрыядычна выкліканьні профатаў у Выканбюро для праверкі тролю працы; забараніць усякія сходы ў час заняткаў, рэдкалегіям насьценгазэт і друкаванай унівэрсытэцкай шырэй асьвятляць пытаньні навучальнага жыцьця да поўнага зьнішчэньня прагулаў, спазьненьня выкладчыкаў і студэнтаў на лекцыі і сэмінары.

Якасны вучот працы як студэнцтва, гэтак і выкладчыкаў, павінен заняць вялікую ўвагу. Фармальны момант здачы залікаў ня мог даць якую-небудзь магчымасьць грамадзкім арганізацыям. Дэканатам і Праўленьню БДУ даць дакладную характарыстыку скончыўшаму студэнту.

Адсутнічае стымул для палепшаньня акадэмічнай і грамадзкай працы.

У зьвязку з гэтым Выканбюро БДУ у сваей пастанове зд 9-XII г. г. прыняло наступныя мерапрыемствы:

1. Усім кіраўнікам сэмінараў і груп завесьці якасны вучот працы студэнтаў.

2. Адзначаць якасьць прачытанага дакладу і падрыхтоўкі да яго. Кіраўнікам сэмінарскіх і групавых заняткаў ня менш, як тры разы ў год (15/I, 15/IV і 15/VI—1930 г.) даваць Дэканатам ацэнкі працы кожнага студэнта.

У тых выпадках, калі студэнт ня выявіў сабе дастаткова і кіраўнік сэмінару або групы ня мог яго праверыць у штодзённай працы — прызнаць неабходным арганізацыю спэцыяльных праверак у паказаныя вышэй тэрміны.

У далейшым практыкаваць, як вопыт, праверку якасьці пасьпяховасьці шляхам увядзеньня мэтаду-тэстаў замест залікаў, папярэдне абгаварыўшы гэтае пытаньне на Прадметных Камісіях.

Гэта рэальны крок да ажыцьцяўленьня пастаноў Лістападаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б). **Сушынскі.**

СУПРОЦЬ „МЁРТВАЙ ДЫЯЛЕКТЫКІ“!

Разглядаючы вынікі выкладаньня дыялектычнага матар‘ялізму ў сьценах БДУ неабходна адзначыць, што дыялектычны матар‘ялізм ва ўяўленьні студэнцтва праламляецца часьцей усяго зусім недыялектычна, а наадварот сугуба-мэтафізычна —нават схалястычна.

Гэта схалястычнасьць, схэматызм ва ўладаньні дыялектыкай студэнтамі праяўляецца перш ад усяго ў тым, што яны завучваюць (часьцей вельмі добра, сумленна) законы і катэгорыі дыялектычнай лёгікі ў выглядзе чыстых формул, якія чамусьці патрэбна запомніць.

Так напрыклад, у сьценах БДУ мусіць ня знойдзецца ні воднага студэнта, які-б ня ведаў, што з пункту погляду дыялектыкі, колькасьць пераходзіць у якасьць і наадварот, што асноўны закон дыялектыкі—адзінства працілегласьцяй, што існуе якоесьці дыялектычнае адмаўленьне адмаўленьня... і нават даволі добра запамінаюць прыклады Энгельса з Анты-Дзюрынга аб зярне, аб вадзе, якая кіпіць і г. д.

На гэтым веданьне і разуменьне дыялектыкі ў студэнтаў адрываецца і амаль ні ў якай меры не зьвязана з тымі канкрэтнымі дысцыплінамі, якія студэнты вывучаюць, ні з працай, ні наогул з усім канкрэтным зьместам рэчаіснасьці, якія толькі і могуць навучыць дыялектыцы.

„Дыялектыка“ завучваецца, праўдзівей „зазубрываецца“, у адведзеныя для яе ў навучальным пляне гадзіны і за межамі гэтых гадзін гэта „дыялектыка“ аказваецца бясьсільнай.

Трэба са ўсёй яскравасьцю і жорсткасьцю паставіць пытаньне, што такое вывучэньне дыялектыкі можа прынесьці больш шкоды чым карысьці, бо „дыялектыка“ ў такім разуменьні абарачваецца ў сваю ўласную працілегласьць, г. зн. у мёртвы схэматызм, у мэтафізыку.

Асноўная задача выкладаньня дыялектычнага матар‘ялізму заключаецца ў тым, каб студэнты ўмелі ўспрыняць і зразумець яе не як збор голых „дыялектычных“ схэм, а як адзіны правільны навуковы мэтад, карыстаючыся якім неабходна дзейнічаць і вывучаць канкрэтныя дысцыпліны.

Гэта бязумоўна нялёгкая задача, зразумець дыялектыку менавіта дыялектычна—гэта значыць канкрэтна, а не як суму ўсюды і заўсёды аднолькавых няжыцьцёвых схэм. Аднак, гэта асноўная задача выкладаньня дыялектычнага матар‘ялізму ўпіраецца ва ўсю сыстэму выкладаньня, бо калі дыялектыка адрываецца ад канкрэтных дысцыплін, тым самым няправільна разумеюцца і гэтыя дысцыпліны і іх роля.

Улічваючы схалястычнае праламленьне дыялектыкі ў галовах студэнтаў, выкладчыкам неабходна зьвярнуць сугубую ўвагу на падкрэсьліваньне мэтадалёгічнага значэньня дыялектыкі, на большую канкрэтызацыю самога выкладаньня дыялектыкі.

Само жыцьцё і вучоба настойліва патрабуюць павесьці барацьбу за сапраўдную, жывую, канкрэтную дыялектыку, супроць усякага мэтафізычнага схэматызму і схалястыкі пад маскай дыялектыкі.

Я. Сякерская.

Ліст у рэдакцыю.

№ 1-м газэты „Ленінскім Шляху артыкуле т. Фрыдмана—„Чыпраўгаскай ячэйкі“ паміж іншым зана: „Тав. Літвін прыводзіць клад, што ас. Гуткоўскі цяпер ымліваецца ад дачы якіх-небудзь муліровак, а згаджаецца з усяля фармуліроўкамі студэнтаў, неза- а ад таго ці правільны яны, ці ясьняю:

ры прапрацоўцы пытаньняў, важна выявіць, наскольки яны ўсвоены энтамі ў пастаноўцы Марксыцка-інскай тэорыі, і як студэнты ваюць гэтыя праблемы з сучасным льцём.

сім удзельнікам сэмінару давалася ая магчымасьць выяўляць свае пал этычныя і практычныя веды; пры- недакладнасьць і непаўната, вы- ныя аднымі студэнтамі, зараз-жа раўляліся і дапаўняліся другімі, больш, што студэнты зьяўляліся заняткі амаль што ўсе пазнаёміўшыся добра з прапанаванай ім літаратурай.

Мне, як кіраўніку сэмінарскіх заняткаў, аставалася накіроўваць спрэчкі на сутнасьць справы і на мажліва поўнае ўсьведамленьне сучасных зьявішч савецкага дзяржаўнага жыцьця ў асьвятленьні гатовых фармуліровак Маркса, Леніна, Сталіна. Сваіх фармуліровак па паказаных пытаньнях я даваць ня мог, і не павінен быў даваць.

Асыстэнт **Гуткоўскі.**

Ад рэдакцыі: Аўтар адказу памылкова лічыць, што прадастаўленьне студэнтам магчымасьці выявіць свае веды нясумесна з кіруючымі ўказаньнямі выкладчыка. Калі грунтавацца на тым, што недакладнасьці і непаўната выступленьняў адных студэнтаў будуць выпраўляцца другімі, дык тады становяцца непатрэбнымі і кіраўнікі сэмінараў.

СКАРОЦІМ ТЭРМІНЫ НАВУЧАНЬНЯ Ў БДУ.

Выходзячы з вялікага запатрабаваньня ў пралетарскіх кадрах для шпаркага разьвіцьця індустрыялізацыі нашай прамысловасьці, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і падняцьця культурнага ўзроўню працоўных мас усе кіруючыя органы БДУ, студэнцкія арганізацыі і навуковыя працаўнікі павінны пераключыць сваю працу ў бок больш шпаркіх яе тэмпаў.

Праўленьне БДУ на апошнім сваім паседжаньні пастанавіла: Тэрмін навучаньня на Праўным аддзяленьні Праўгасу зрабіць 3-гадовым і даручыла Дэканту хутка распрацаваць навучальны плян, выходзячы з гэтага тэрміну;

Сучасны 4-ы курс Праўнага аддзяленьня выпусьціць ня ўвосень, а вясною ў канцы сакавіка 1930 г., прыстасаваўшы да гэтага тэрміну праграму курсу;

Застаўшыся тэрмін навучаньня да 1-га кастрычніка 1930 году разьбіць на тры трымэстры для цяперашняга 3-га курсу, адвёўшы пэўны час для вытворчай практыкі, і выпусьціць яго 1-га кастрычніка бягучага акад. году.

Па Хэміка-Тэхналёгічным факультэце, курс навучаньня якога з пачатку намячаўся на 5 год, навучальны плян будзе перабудаваны на 4-гадовы, з наступнымі суадносінамі тэорыі да вытворчай практыкі: 50—60% тэорыі і 50—40% вытворчай практыкі.

Такім чынам зьменшыўшы навучаньне на Хэм.-Тэхн. факультэце і сьцісла ўвязаўшы тэорыю з вытворчай практыкай, мы зможам хутчэй на 1 год даць для прамысловасьці БССР неабходную колькасьць інжынэраў.

Па іншых факультэтах Праўленьне БДУ яшчэ ня прыняла ніякіх канкрэтных рашэньняў у сэнсе скарачэньня тэрміну навучаньня. Але і там можна што-небудзь зрабіць. Напрыклад, на Пэдфаку,—раз мы з гэтага году пачалі прымаць на першы курс скончыўшых пэдтэхнікумы ды яшчэ з пэдагагічным стажам, можна па шмат якіх аддзяленьнях курс навучаньня зрабіць 3-гадовы, і такім чынам выпускаць больш шпаркім тэмпам настаўнікаў для II канцэнтру, дзе ўжо і зараз адчуваецца вялікі недахоп у настаўніках з вышэйшай кваліфікацыяй, а ў бліжэйшыя 2-3 гады будзе, бязумоўна, вялікі дэфіцыт у іх, бо ня трэба забываць таго, што мы маем толькі адзін Пэдфак на ўсю БССР, а школьная сетка з году ў год усё больш і больш будзе пашырацца.

Па Мэдфаку пры бесьперапынным годзе навучаньня можна будзе дабіцца бяз ушчэрбу справе некаторага скарачэньня тэрміну навучаньня, давёўшы яго да $4^1/_2$ год, а мо і да 4-х год. Добра было-б, каб нашы прафэсары-мэдыкі выказаліся па гэтым пытаньні на старонках студэнцкай газэты і ў прадметных камісіях.

Рабфакі— нашыя галоўныя пралетарскія крыніцы для ВНУ, хаця ў асноўным ня дрэнна рыхтуюць рабоча-сялянскую моладзь, але веды па шмат якіх дысцыплінах рабфакаўцы набываюць павярхоўна, пад час не аўладаўшы тэхнікай і глыбінёй пазнаньня прадметаў, без належнай начытанасьці і зацікаўленасьці пэўнай дысцыплінай і ня цьвёрдым уменьнем выказваць свае думкі вусна і пісьмова.

Кожны з максымальным напружаньнем павінен ўзяцца за вырашэньне праблемы кадраў і, як кажа т. Сталін, „аўладаць гэтай крэпасьцю ва што-бы та ні стала“. **Каранеўскі.**

Хуткімі тэмпамі падрыхтаваць новыя кадры.

Пленум ЦК УсеКП(б) даў дыктыву ўсім вышэйшым навуковым установам скараціць мін навучаньня ў ВНУ ў ах паскарэньня выпуску спэціялістых.

нас, у навучальных плянах хапае хламу, выкінуўшы мы зробім толькі карысьць справы.

мінулым годзе на сацыяльгістарычным аддзяленьні Пэду быў выкінуты з навучальна пляну цэлы рад дысцыплін. аму тады шалена супраціўніся ўсе тыя, хто чапляўся за рыя ўнівэрсытэцкія традыхто баяўся навін і г. д. А знойдзецца зараз хаця адзін авек, які даводзіў-бы, што рачэньне навучальных пляпрынесла якую-небудзь шкопадрыхтоўцы грамадаведаў.

ам думаецца, што калі ўважі, у той-жа час, з падобнай рэвалюцыйнай рашуцю падыйсьці да праграм ых факультэтаў і аддзяленьто і там можна зрабіць чныя скарачэньні і там можна з вялікай карысьцю для справы выкінуць рад дысцыплін.

Ужо адзін гэтакі перагляд навучальных плянаў дасьць магчымасьць зрабіць некаторае скарачэньне тэрмінаў навучаньня

Але справа ня толькі ў навучаньных плянах. Неабходна паставіць 1 вырашыць пытаньне аб павялічэньні тэрмінаў навучаньня ў кожным навучалчным годзе. Слова „навучальны год“, якое мы ўжываем, трэба разумець вельмі ўмоўна. Мы вучымся, калі казаць праўду, ніяк ня больш 7-мі месяцаў у годзе. Астатні час ідзе на зімовыя і летнія вакацыі, на заліковыя сэсіі, якія непамерна расьцягваюцца, на разьезд студэнтаў, які пачынаецца за тыдзень да вакацый, і зьезд студэнтаў, які канчаецца праз два тыдні пасьля вакацый. Такі тэмп працы ні куды ня варты.

Як-жа пазбавіцца ад такога становішча? У першую чаргу, трэба рашуча пераглядзець мэтады нашых заняткаў. Скараціўшы навучальныя пляны, скараціўшы колькасьць дысцыплін, мы здолеем перайсьці да сапраўды актыўных мэтадаў заняткаў. Да гэтага часу мы знаходзімся ў гэтым пытаньні цалкам у палоне старых традыцый. Мы даем сябе запужаць усялякімі довадамі супроць актыуных мэтадаў заняткаў, довадамі, якія адпадаюць пры першай-жа спробе сур‘ёзнай крытыкі.

А між тым, не гаворачы ўжо пра ўсе перавагі актыўных мэтадаў, яны дадуць нам магчымасьць пакончыць з залікамі, а значыць, і з заліковымі сэсіямі, якія адбіраюць у нас не адзін месяц у навучальным годзе. Замест гэтых месяцаў хваляваньня каля дзьвярэй прафэсара, які прымае залікі, зазубрываньня адказаў на звычайныя пытаньні, што ставяцца прафэсарам і г. д. і г. д., мы будзем мець месяцы здаровай, нармальнай навучальнай работы.

Такім чынам, пераход ад лекцыйна-заліковага мэтаду да актыўных мэтадаў, а таксама і перагляд навучальных плянаў дасьць нам значную эканомію ў часе, эканомію, за кошт якой мы здолеем скараціць тэрмін навучаньня. Але, апрача гэтага трэба паставіць пытаньне аб тым, каб пакончыць са славутай „канікулярнай“ традыцыяй і перайсьці на бесьперапынны навучальны год. Трэба паставіць пытаньне аб тым, каб студэнт займаўся на працягу году ня менш 10 месяцаў. Гэткае павялічэньне навучальнага году дасьць нам магчымасьць дабіцца скарачэньня тэрмінаў навучаньня.

У чым-жа цяжкасьці пераходу на бесьперапынны навучальны год? Галоўным чынам у матар‘яльным становішчы студэнцтва. Пры сучасным становішчы, калі памер стыпэндыі недастатковы, а колькасьць стыпэндый яшчэ больш недастатковая, студэнт ня можа працаваць у навучальнай установе цэлы год. Ён павінен улетку мець магчымасьць падзарабіць, падкарміцца, адпачыць.

Але гэта такая цяжкасьць, якую можна асіліць. Скарачэньне тэрмінаў навучаньня дасьць нам такую значную эканомію, што мы здолеем і павінны будзем павялічыць і колькасьць і памер стыпэндый.

Другая цяжкасьць заключаецца ў тым, што навуковыя працаўнікі нібы ня будуць мець часу для навуковай працы. Але, зусім не абавязкова, каб прафэсары і дацэнты чыталі свой курс на працягу ўсяго навучальнага году. Наадварот, па розных меркаваньнях зусім неабходна сьціснуць курсы такім чынам, каб яны пры большай колькасьці гадзін у тыдзень былі пройдзены ў меншую колькасьць месяцаў.

Студэнтам куды лепш на кожным пэўным адрэзку часу займацца меншай колькасьцю прадметаў, аддаючы кожнаму прадмету большую колькасьць гадзін.

Вось, таму такі расклад заняткаў на год, пры якім кожны прафэсар будзе мець 2-3 месяцы вольных, спэцыяльна для навуковай працы, прынясе толькі карысьць для справы.

Такім чынам, і гэту перашкоду без усялякіх цяжкасьцяй можна перамагчы.

Увядзеньне бесьперапыннага навучальнага году, пераход да актыўных мэтадаў заняткаў, скарачэньне навучальных плянаў — усё гэта разам узятае дасьць магчымасьць скараціць тэрмін навучаньня і адначасна значна палепшыць якасьць выпушчаемай прадукцыі. **Е. Р.**